# Семінар 10.
## Народы і рэлігіі Беларусі.
## Беларусь у геапалітычнай праторы

### Гісторыя фарміравання асноўных этнічных груп у Беларусі. Этнічны склад сучаснай Беларусі

У эпоху ВКЛ асноўная частка насельніцтва сучасных зямель Беларусі складалася з праваслаўных русінаў, прамымі нашчадкамі якіх з'яўляюццца сучасныя беларусы. Усходнелітоўскае насельніцтва жыло ў раёне Ашмянаў, Ліды, Шчучына. З цягам часу частка гэтых балтамоўных літвінаў моўна і культурна асімілявалася і склала аснову старакаталіцкага беларускамоўнага насельніцтва нашай краіны. Латышы кампактана жылі ў Браслаўскім, Дзісненскім, Мёрскім раёнах. Вялікаросы-стараверы, уцекачы з Маскоўскай дзяржавы, якія ратаваліся ад рэлігійнага перасьледу, аселі ў Падзвінні і Падняпроўі. Палякі і асіміляванае ў ходзе паланізацыі беларускае і літоўскае насельніцтва жылі на Берасцейшчыне і Гродзеншчыне. Татарскае і яўрэйскае насельніцтва на землях Беларусі з'яўляецца ў XIV – XV стст. З 1501 г. фіксуюцца паведамленні аб цыганскай прысутнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Важнейшымі цэнтрамі цыганскай культуры ў ВКЛ былі Мір, Смаргонь і Эйшышкес.

Этнічная структура насельніцтва Беларусі, якая склалася яшчэ у эпоху існавання ВКЛ, працягвала існаваць, з неістотнымі зменамі, на працягу ўсяго існавання Расійскай імперыі.

**Рускія (маскоўцы, маскалі) (саманазва русские).** Народ усходнеславянскай моўнай групы. Асноўнае насельніцтва Расійскай Федэрацыі.

У выніку рэформы патрыярха Нікана і расколу рускай праваслаўнай царквы ў другой палове XVII – пачатку XVIII стст. у Беларусь перасялілася некалькі дзесяткаў тысяч рускіх, якія ўтварылі тут замкнёную этнаканфесійную групу стараабраднікаў (раскольнікаў). Яны выразна адрозніваліся ў культурна-пабытовым плане ад мясцовага насельніцтва. Знешні выгляд і адзенне адрознівалі іх ад беларусаў: мужчыны абавязкова мелі бароды, насілі доўгія каптаны, шаравары, запраўленыя ў боты, падзёвы. Аснову жаночага строю складаў сарафан з сітца, штофу ці нават шоўку. Грамадскі быт стараабраднікаў таксама быў своеасаблівым. Катэгарычная забарона датычылася палення тытуню, строга рэгламентаваным было спажыванне алкаголю.

Колькасць рускіх (без уліку старавераў) у беларускіх губернях нават у 1861 г. была вельмі малой – каля 10 тыс. чалавек (альбо 0,3% усяго насельніцтва). Аднак, да канца XIX ст. колькасць рускіх узрасла ў 23 разы і склала ўжо 235 тыс. чалавек, ці 3,6% усяго насельніцтва. Рускія складалі 54% праваслаўнага духавенства, 46% чыноўнікаў, 19% дваран і 10% купецтва.

**Татары (саманазва татар)**, народ цюркскай моўнай групы ва Ўсходняй Еўропе і Паўночнай Азіі. Першыя звесткі пра знаходжанне татараў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XIV ст. У 1395 г. Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша і яго людзей, якія пасяліліся ў ваколіцах Ліды. Шмат татараў было перасelena ў ВКЛ у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў у 1397 г. (гэта дата традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на тэрыторыі Беларусі). Татары былі размешчаны каля Вільні, у Лідскім, Ашмянскім, Навагрудскім, Брэсцкім паветах, на ўмовах
нясення вайсковай службы яны атрымалі зямельныя ўладанні.

У Беларусі татары пасяляліся родаплемяннымі групамі (улусамі). Усе ваеннаслужачыя татары падзяляліся на харуствы (тыя ж племянныя улусы), а ў ваенных адносінах – на сцягі (атрады). Падзел на улусы існаваў у татараў Беларусі да канца XVII ст. Паводле сацыяльна-эканамічнага стану татарскае насельніцтва на землях ВКЛ у XVI – XVII стст. дзеліцца на 3 катэгорыі: − найбольш прывілеяваная група – прамыя нашчадкі ардынскіх ханаў і мурзаў. Яны валодалі вялікімі вотчынамі з сялянамі, за што павінны былі несці вайсковую службу; нашчадкі простых воінаў, якія атрымалі невялікія зямельныя надзелы і апрача вайсковай службы выконвалі павіннасці на карысць вялікага князя (транспартную, кур’ерскую, вартавую і інш.); гарадскія («простыя») татары – самая бедная група, якая сфарміравалася з ліку тых перасяленцаў, што на гістарычнай радзіме былі не феадаламі, а вольнымі, або залежнымі, «ясачнымі людзьмі». У гарадах і мястэчках ім адводзілася зямля пад сядзібы і агароды. Яны неслі павіннасці, як і мяшчане, плацілі пагалоўны падатак. Асноўнымі іх заняткамі былі рамізніцтва, гарбарства, агародніцтва. Негледзячы на пэўныя ільготы і рэлігійную верацярпімасць (свабодна дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці), татары ў ВКЛ не мелі права ўдзельнічаць у выбарах у сойм і мясцовыя соймікі, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

У XVI – пачатку XVII ст. татары ВКЛ паступова страцілі родную мову і сталі карыстацца беларускай. На беларускай мове, але арабскім пісьмом, была створана багатая літаратура беларуска-літоўскіх татараў – кітабы (кнігі з легендарным, казачным, маральна-этычным, павучальным зместам), тэджвіды (кнігі-падручнікі па навуцы чытання Карана), тэфсіры (кнігі-падручнікі з каментарыямі і тлумачэннямі Карана), хамаілы (малітоўнікі) і інш. У XIX ст. узнікаюць новыя цэнтры татарскага насельніцтва ў Паўночнай Беларусі – у Відзах, Докшыцах, Глыбокім, Мядзеле. Агульная колькасць татараў на беларускіх землях у 1897 г. склала 13 877 чалавек.

**Цыганы (саманазва рома)**. Продкі – выхадцы з Індыі (канец І тыс. н.э.). На тэрытрыі Беларусі вылучаюцца групы так званых рускіх цыганоў (жывуць на Ўсходзе Беларусі, саманазва «руска рома», а паводле веравызнання – праваслаўныя) і беларуска-літоўскіх цыганоў (паўночна-

заходняя Беларусь і памежныя раёны Літвы, саманазва «польска рома», паводле веравызнання – каталікі). У Беларусі цыганы з'явіліся ў XV ст., прывандраваўшы з Польшчы і Германіі. У канцы XVI – пачатку XVII стст. яшчэ адна плыня цыганоў прыйшла з тэрыторыі Венгрыі. Сярод тутэйшага люду цыганы славіліся як добрыя спецыялісты ў гадоўлі і вывучцы каней, высокапрафесійныя кавалі. Рзам з тым да цыганаў мясцовае насельніцтва ставілася падазрона і непрыхільна. Прычынай гэтаму было конекрадства, заняткі варажбой, знахарствам і папрашайніцтвам. Таму не аднаразова прымаліся пастановы аб выгнанні цыганаў з тэрыторыі ВКЛ. Але яны, як правіла, мэты не дасягалі. Найбольш значным цэнтрам аселых цыганоў было мястэчка Мір, дзе яны ў другой палове XVIII ст. заснавалі суконныя, палатняныя і футравыя мануфактуры. Тут жа ў 1778–1790 гг. знаходзілася рэзідэнцыя і найбольш вядомага «цыганскага караля» (выбарны вярхоўны правіцель цыганоў, паўнамоцтвы якога падцвярджалі магнаты ці каралеўская канцылярыя) Яна Марцінкевіча.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай колькасць цыганоў на беларускіх землях істотна скарацілася. Большая частка цыганоў у той час перасялілася ў Бесарабію, Малдову і Валахію. Вандроўныя цыганы, якія засталіся ў Беларусі, вымушаны былі, па загаду царскай адміністрацыі, прыпісвацца да сельскіх абшчын ці мястэчак, дзе яны жылі асела толькі ў халодную пару года. У весну ж, сабраўшыся табарам (3 – 5 сем'яў) пад кіраўніцтвам важака, цыганы выпраўляліся ў вандроўку. Для вырашэння спрэчак і канфліктаў існаваў цыганскі суд, у які ўваходзілі найбольш паважаныя і старэйшыя па ўзросту мужчыны табара

**Палякі (саманазва polacy),** народ заходнеславянскай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Польскай Рэспублікі. Большасць веруючых палякаў – католікі. Яшчэ ў XII – XIII стст. пад націскам крыжацкай агрэсіі адбылося перасяленне часткі ляшскага насельніцтва (люцічаў, мазаўшан, памаран) на тэрыторыю беларускага Панямоння. Узмацненне польскага этнакультурнага ўплыву ў Беларусі прыпадае на перыяд пасля Люблінскай уніі 1569 г., калі беларускія землі разам з іншымі землямі ВКЛ увайшлі ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. Частка беларускага насельніцтва, асабліва прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, гарадской вярхушкі, прымаючы каталіцкую веру, змяняла сваё этнічнае самавызначэнне. З XVII ст. паланізацыя беларускіх магнатаў і шляхты набыла вялікія маштабы, многія з іх, этнічныя беларусы па нараджэнню, пазней прыпісвалі сабе польскае паходжанне. Да пачатку XX ст. паланізаваную беларускую шляхту ўстойліва прылічвалі да палякаў. За перыяд існавання Рэчы Паспалітай на беларускіх этнічных землях і беларуска-літоўскім этнічным памежжы ўтварыліся пэўныя тэрыторыі, на якіх сяляне, што былі католікамі па веравызнанні, вызначалі сваю этнічную прыналежнасць як польскую і імкнуліся да перайманне польскай культуры.

**Латышы** (саманазва latviesi), народ балцкай моўнай групы, асноўнае

насельніцтва Латвійскай Рэспублікі. Як асобная этнічная група на тэрыторыі Беларусі, латышы пачалі фарміравацца толькі з канца XVIII ст., што было звязана з перасяленнем латышскіх каланістаў на паўночна-усходнія беларускія землі. На Віцебшчыне латышы ўтваралі хутары і невялікія сельскія паселішчы, на Магілёўшчыне – пераважна вёскі. У 1897 г. найбольш значныя групы латышоў жылі ў Віцебскім (каля 4 тыс. чалавек), Полацкім (каля 1,7 тыс. чалавек), Аршанскім (да 3,7 тыс. чалавек) і Быхаўскім (каля 1 тыс. чалавек) паветах. Большасць веруючых латышоў у Беларусі былі лютэране, нязначная частка – католікі і праваслаўныя. У пачатку XX ст. у Лёзне дзейнічала латышскае праваслаўнае брацтва.

**Літоўцы (саманазва lietuviai, летувяй)**, народ балцкай моўнай групы, асноўнае насельніцтва Літоўскай Рэспублікі.

Шматлікая арыстакратыя літоўскага паходжання ў эпоху ВКЛ мела тэндэнцыю да абеларушвання, а з другой паловы XVII ст. – да паланізацыі. Тая ж тэндэнцыя была характэрна і для літоўскага гарадскога насельніцтва. Моцны культурны ўплыў беларусаў зазналі літоўскія сяляне дзукі (лакальная група аўкштайтаў, што лакалізуецца на Паўднёвым Усходзе Літвы, у Дзукіі). Да канца XIX ст. гэта прывяло да беларусізацыі Віленскага краю. Яшчэ ў першай палове XX ст. асобныя жыхары заходняй Гродзеншчыны, Ашмяншчыны і Слонімшчыны ўзгадвалі, што іх бацькі ці дзяды размаўлялі на літоўскай мове, якую яны ўжо не ведаюць. У 1870–1890-х гг. адзначана перасяленне літоўскіх сялян на ўсходнія і паўночна-усходнія землі Беларусі. У 1897 г. кампактныя групы літоўцаў жылі ў Лідскім (17 285 чалавек), Ашмянскім (8754), Гродзенскім (2814), Аршанскім (каля 1400), Сенненскім (каля 800) і шэрагу іншых паветаў. Перад Першай сусветнай вайной толькі на ўсходзе Беларусі жыло каля 10 тыс. літоўцаў.

У XIV – XV стст. на тэрыторыі ВКЛ стала рассяляцца субэтнічная група **яўрэяў – ашкеназы** (ад Ашкеназ-Германія). Яны размаўлялі на нямецка- яўрэйскай мове ідыш (іўрыт выконваў культавыя функцыі). На тэрыторыі Беларусі і Літвы ашкеназы склалі асобную этнаграфічную групу – **літвакоў**. Першыя буйныя абшчыны яўрэяў скаліся ў Берасці і Гародні. Апроч Берасця і Гародні, яўрэйскія абшчыны ўзніклі ў Наваградку, Слоніме, Клецку, Полацку, Віцебску і іншых гарадах.

У XVI ст. перасяленне яўрэяў у ВКЛ значна павялічылася за кошт эмігрантаў з нямецкіх зямель, Італіі і Чэхіі. У 1560-я гг. агульная колькасць яўрэяў на тэрыторыі ВКЛ дасягала 20 тыс. чалавек, а ў 1628 г. – каля 40 тыс. У гарадах і мястэчках Беларусі яны складалі да 10% насельніцтва. Асноўнай сферай іх дзейнасці стаў гандаль, фінансавыя аперацыі і рамяство. Улады ВКЛ былі зацікаўлены ў яўрэйскай прысутнасці, стваралі спрыяльныя ўмовы для іх. За забойства яўрэя нават шляхціч павінен быў быць пакараны смерцю, у той час, як за забойства селяніна яго чакаў толькі грашовы штраф. Разам з тым, існавалі і пэўныя абмежаванні для іх

як вызнаўцаў іудаізма. Паводле заканадаўства яўрэі не мелі права займаць дзяржаўныя пасады, валодаць прыгоннымі сялянамі (хрысціянамі), быць сведкамі ў судовых спрэчках з хрысціянамі. За схіленне мясцовага хрысціяніна да пераходу ў іудаізм яўрэя чакала смяротнае пакаранне праз спаленне.

У XVI ст. аформілася абшчынная форма яўрэйскага самакіравання – кагал. Вышэйшым іх органам былі ваады – з'езды рабінаў (духоўных кіраўнікоў веруючых абшчын) і кагальных прадстаўнікоў. У 1623–1764 гг. вышэйшым органам яўрэяў ВКЛ быў Літоўскі ваад.

Пастановы сеймаў Рэчы Паспалітай (1764, 1768 гг.) скасавалі шэраг ранейшых прывілеяў яўрэяў (у тым ліку права набываць шляхецтва) і ўвялі абмежавальныя меры ў сферы рамёстваў і гандлю. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ўсе беларускія губерні былі ўключаны ў мяжу яўрэйскай аселасці. Яўрэям было забаронена сяліцца ва ўнутрырасійскіх рэгіёнах. Гэта прывяло да рэзкага росту яўрэйскага насельніцтва ў беларускіх гарадах і мястэчках. Паводле перапісу 1897 г. колькасць яўрэяў у пяці беларускіх губернях складала больш за 1202 тыс. чалавек (14,1% усяго насельніцтва і каля 40% гарадскога насельніцтва). У прамысловасці Беларусі яўрэі складалі 56,5% ад усіх занятых, у гандлі – 88,6% (у той час як беларусы – толькі 1,7% купцоў).

Пасля Першай сусветнай вайны нацыянальная структура насельніцтва працягвала захоўвацца прыкладна такой самай.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. яўрэі атрымалі роўныя правы з грамадзянамі ўсіх нацыянальнасцей краіны. У 1921 г. дэкрэтам ЦВК БССР мове ідыш быў нададзены статус дзяржаўнай разам з беларускай, рускай і польскай. Былі створаны і яўрэйскія нацыянальныя адміністрацыйна- тэрытарыяльныя адзінкі – 19 местачковых і 3 сельскія саветы. Актыўна развівалася яўрэйская адукацыя і культура. У 1927 г. налічвалася 147 пачатковых і 53 сямігадовыя яўрэйскія школы, 3 педтэхнікумы; на ідыш выдаваліся кнігі, часопісы і газеты.

У канцы 1930-х гг. развіццё культуры і адукацыі яўрэяў на іх нацыянальнай мове ў Беларусі, як і іншых нацыянальных меншасцей, было згорнута. У час Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай тэрыторыі Беларусі яўрэі зведалі генацыд з боку нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1920–1930-х гг. у БССР было створана некалькіх цыганскіх калгасаў у Віцебскім, Лёзненскім, Езярышчынскім і Жлобінскім раёнах. Але большасць цыганоў працягвала весці вандроўны ці паўвандроўны лад жыцця. У Вялікую Айчынную вайну цыганы, як і яўрэі, планамерна вынішчаліся нямецкімі нацыстамі.

У савецкі час, у перыяд ажыццяўлення беларусізацыі, пастановай ЦВК БССР (1921) за рускай мовай быў замацаваны статус адной з дзяржаўных, што давала рэальную магчымасць рускім дзецям (6% ад агульнай колькасці вучняў) атрымліваць адукацыю на роднай мове. У 1926–1927 гг. было створана і 14 нацыянальных рускіх сельсаветаў.

Паводле перапісу 1926 г. у БССР было 6564 літоўцаў, у тым ліку да 2 тыс. гараджан (Віцебск, Барысаў, Гомель, Мінск). Да калектывізацыі літоўцы БССР утваралі больш за 50 асобных населеных пунктаў. У месцах кампактнага рассялення літоўцаў у 1920–1930-я гг. існавалі нацыянальныя калгасы (з 1928 па 1939 г. існаваў Малькаўскі літоўскі нацыянальны сельсавет). У БССР дзейнічалі літоўскія школы (у 1934–1935 гг.), працаваў літоўскі сектар Акадэміі навук, выдавалася газета «Raudonasis Artoias» («Чырвоны араты»), рэспубліканскае радыё трансліравала перадачы на літоўскай мове.

У 1920-я гг. былі створаны нацыянальныя латышскія сельсаветы (Быхаўскі, Лёзненскі, Клімавіцкі, Глускі, Ушацкі раёны), адкрыты латышскіяшколы, на латышскай мове выходзіла літаратура, гучалі радыёперадачы. Аднак, ужо ў 1936–1940 гг. большая частка латышоў была рэпрэсавана і выслана за межы БССР.

Павелічэнне колькасці палякаў у Беларусі ў ХХ ст. адбывалася ў асноўным на заходнебеларускіх землях, якія ў 1921–1939 гг. уваходзілі ў склад Польшчы. Ва ўмовах нацыянальна-культурнага, рэлігійнага і сацыяльнага прыгнёту беларускага насельніцтва, польскія ўлады праводзілі актыўную палітыку акаталічвання і паланізацыі беларусаў, украінцаў і літоўцаў. У Заходнюю Беларусь з этнічных польскіх зямель перасяліліся групы асаднікаў (ваенных і цывільных каланістаў), розныя катэгорыі рабочых і чыноўнікі (усяго каля 300 тыс. чалавек).

У той жа час у БССР, дзе палякі з’яўляліся адной з асноўных этнічных груп (паводле перапісу 1926 г. – 97,5 тыс. чалавек), этнакультурныя асаблівасці польскага насельніцтва, спецыфіка этнічных сувязей беларускага і польскага народаў улічваліся. У БССР дзейнічала 136 польскіх школ, педагаічны тэхнікум, польскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. На польскай мове выдаваліся кнігі, часопісы і газеты. У месцах кампактнага пражывання польскага насельніцтва з 1926 г. быў створаны 31 польскі нацыянальны сельсавет. У 1932–1937 гг. існавала аўтаномная адзінка – Польскі нацыянальны раён (цэнтр – Койданава), дзе было 10 польскіх нацыянальных сельсаветаў. Вывучэннем матэрыяльнай і духоўнай культуры палякаў у Беларусі займаўся польскі сектар Інбелкульта. У выніку палітычных рэпрэсій і пагаршэння савецка-польскіх адносін у 1937 г. культурнае і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва палякаў у БССР было згорнута.

Па дамоўленасці паміж уладамі БССР і ПНР у 1944–1948 гг. у рамках абмену насельніцтва з Беларусі ў Польшчу было пераселена 274,2 тыс. чалавек польскай нацыянальнасці.

У 1989–1999 гг. усю работу па нацыянальна-культурным адраджэнні самабытнага татарскага народа Беларусі разам з Мусульманскім аб’яднаннем Рэспублікі Беларусь каардынавала Беларускае згуртаванне татараў-мусульман
«Аль-Кітаб» («Кніга»). За гэты час былі адбудаваны цэнтры

этнаканфесійнай культуры татараў – мячэці ў Слоніме (1994), Смілавічах (1996), Навагрудку (1997), Відзах (1999), Клецку (2000), Лоўчыцах (2000), створаны татарскі культурны цэнтр у Іўі (1995).

У пасляваенны час большасць цыганоў Беларусі перайшла да аселага жыцця, утварыўшы шэраг кампактных паселішчаў. З сярэдзіны 1990-х гг. на тэрыторыі Беларусі з'явіліся прадстаўнікі этнаграфічных груп сярэднеазіяцкіх цыганоў мусульманскага веравызнання – джугі ці люля (выхадцы, адпаведна, з Узбекістану і Таджыкістану), асноўным промыслам якіх з'яўляецца жабрацтва. На 2002 г. у Рэспубліцы Беларусь былі зарэгістраваны тры цыганскія грамадскія нацыянальна-культурныя аб'яднанні, якія захоўваюць і развіваюць этнакультурную самабытнасць беларускіх цыганоў.

Набыццё краінай незалежнасці, умацаванне нацыянальнай тоеснасці, вяртанне беларусаў на этнічную Радзіму прывяло да павялічэння колькасці тытульнай нацыянальнай супольнасці.

У другой палове 1980-х гг. у сувязі з развіццём дэмакратызацыі ў СССР пачалося адраджэнне культуры палякаў Беларусі. Былі створаны саюзы палякаў больш чым у 30 гарадах краіны, пачалі актыўна дзейнічаць польскія мастацкія калектывы і культурныя цэнтры. Адкрыліліся польскія школы ў Гродне, Ваўкавыску, Сапоцкіне і асобныя польскія класы ў школах Мінска, Клецка, Койданава (Дзяржынска). Створаны польскія грамадскія аб'яднанні.

На сённяшні момант большасць літоўцаў Беларусі пражывае ў Гродзенскай вобласці – у Астравецкім і Воранаўскім раёнах. Тут дзейнічае тры літоўскія школы, у в. Рымдзюны (Астравецкі раён) існуе Літоўскі грамадска- культурны цэнтр.

***Сучасны стан***

Агульная колькасць насельніцтва ў 2019 г. перавысіла 9,4 млн чалавек. Пераважную большасць заканамерна складаюць беларусы – 84,9 % (7.990.719 чал.).

Найбольш шматлікімі меншасцямі з'яўляюцца прадстаўнікі нацый суседніх дзяржаў: рускія – 7,5 %, палякі – 3,1 %, украінцы – 1,7 %. У сучаснай Рэспубліцы Беларусь таксама пражываюць яўрэі, армяне, татары, цигане, азербайджанцы, літоўцы, туркмены і інш.

**Канфесійная гісторыя Беларусі.**

У перыяд сярэдневякоўя беларускія землі апынуліся пад уздзеяннем дзвюх культурных традыцый: праваслаўна-візантыйскай і рыма-каталіцкай. У X – XI ст. цывілізацыйны выбар робіцца на карысць Візантыі. На беларускіх землях распаўсюджваецца хрысціянства ў яго ўсходнім адгалінаванні. Язычніцкая рэлігія ўжо не адпавядала кіруючым вярхам грамадства ў забеспячэнні адносін панавання, развіцці палітычных сувязей з хрысціянскімі краінамі, пашырэнні гандлёвых адносін з Царградам, краінамі Цэнтральнай Еўропы.

Распаўсюджванне хрысціянства ў гэты час звязана з палітыкай кіеўскага князя Уладзіміра. У 988 г. ён «*крести же и всю землю Русскую от конца и до конца и идолы сокруши»*. У гарадах пачалі стварацца тэрытарыяльныя царкоўныя акругі – епархіі на чале з епіскапамі. Епіскапская кафедра была створана ў 992 г. у Полацку, у 1005 г. у Тураве.

З прыняццем хрысціянства на беларускіх землях з'явілісая першыя культавыя пабудовы (храмы, манастыры), адкрываліся школы. З адкрыццём епіскапскай кафедры ў Полацку і фарміраваннем хрысціянскай абшчыны на полацкай зямлі ўтварылася свая школа дойлідства, пашырылася асвета, развівалася кніжная культура.

Безумоўна, распаўсюджванне хрысціянства доўжылася працяглы час. Язычніцтва мела глыбокія карані. Яно доўга захоўвалася на землях балцкіх плямёнаў, а таксама на тэрыторыі беларускага Панямоння. Ёсць звесткі, што ў 1009 г. каталіцкі епіскап Бруна (Брунон) з 18 місіянерамі прапаведаваў хрысціянства сярод яцвягаў. Пасля забойства Бруна «*на мяжы Прусіі, Літвы і Рус»*" місія была спынена.

Да канца XII ст. у Еўропе склаліся дзве рэлігійныя зоны: праваслаўна-візантыйская і рымска-каталіцкая. Беларусь была на памежжы двух хрысціянскіх веравызнанняў. Гэта вызначыла яе канфесійную своеасаблівасць. У XI – XIII стст. Беларусь была амаль цалкам праваслаўнай. Нацыянальна-культурнае развіццё праходзіла пад уплывам культуры Візантыі, якая знаходзілася тады на больш высокім узроўні ў параўнанні з Заходняй Еўропай. З другой паловы XIII ст. актывізуе сваю дзейнасць каталіцкі касцёл.

Вялікаму Княству Літоўскаму быў уласцівы нацыянальна-рэлігійны дуалізм. Язычніцкая Літва і праваслаўная Русь мірна суіснавалі пад уладай вялікіх князёў. У 1254 г. хрысціўся ў праваслаўе, а потым стаў манахам Войшалк – сын Міндоўга. Ён заснаваў каля Навагародка Лаўрышаўскі манастыр. Праваслаўнымі былі большасць баяр пры Гедымінавым двары. Характэрна, што Гедымін, будучы язычнікам, не перашкаджаў, як і яго папярэднікі, распаўсюджванню хрысціянства на падуладных яму землях, запрашаючы каталіцкія місіі на свае тэрыторыі. Гэта з'яўляецца адной з найбольш важных характарыстык рэлігійнай палітыкі таго часу.Альгерд у маладосці зрабіў крок да праваслаўя, а незадоўга да смерці, як сцвярджаецца ў позніх усходнеславянскіх крыніцах, прыняў гэту веру. Але грунтоўных доказаў на гэты конт няма. Нейкі час праваслаўе спавядаў князь Вітаўт. Была рэальная перспектыва пераўтварэння княства ў выключна славянскую дзяржаву з праваслаўнай царквой.

Падпісанне ў 1385 г. Крэўскай уніі змяніла рэлігійную сітуацыю на беларускіх землях. Збліжэнне з Польшчай спрыяла пашырэнню каталіцтва, узмацненню сувязей з заходняй культурай. У той жа час праваслаўе ўмацоўвала свае пазіцыі на беларуска-ўкраінскіх і паўночна-ўсходніх землях Беларусі. Беларускія землі ўваходзілі ў склад Полацкай, Тураўскай, часткова Смаленскай і Уладзіміра-Брэсцкай епархій. Яны былі аб'яднаны ў

Кіеўскую мітраполію, падпараткаваную Канстанцінопальскаму патрыярху.

Распаўсюджванне каталіцызму ў ВКЛ адбывалася ва ўмовах актыўнай дзяржаўнай падтрымкі касцёла. Гаспадары дзяржавы даравалі прывілеі каталіцкай царкве (землі, грошы, спрыялі дзейнасці манаскіх ордэнаў). У 1387 г. каталіцкая царква атрымала імунітэт у фінансавых і судовых справах, вызвалялася ад падаткаў і павіннасцей. Артыкулы Гарадзельскага прывілея 1413 г. заахвочвалі феадалаў на пераход у каталіцкую веру.

Хрысціянізацыя і еўрапеізацыя -- галоўныя вектары палітыкі Вітаўта. Царкоўная палітыка Вітаўта была звязана з завяршэннем рэлігійнай канверсіі і канчатковым ператварэннем ВКЛ ў хрысціянскую дзяржаву «дэ-юрэ» і «дэ- факта». Эпоха Вітаўта -- гэта адначасова эпоха канфесійнага дуалізму. З аднаго боку, Вітаўт інтэнсіўна ствараў сетку каталіцкіх інстытуцый улады, з другога, не забываў і аб праваслаўі, сваёй ранейшай веры. Будучы католікам, Вітаўт працягваў заставацца праваслаўным кцітарам.

Жыгімонт І Стары і Жыгімонт ІІ Аўгуст падтрымалі рэлігійную талерантнасць у Вялікім Княстве Літоўскім. Пры Жыгімонце І у дзяржаве з'явілася каля 90 новых праваслаўных храмаў. У 1563 г. Жыгімонт ІІ выдаў прывілей, які адмяняў усе абмежаванні на рэлігійнай глебе. Верацярпімасць стварыла спрыяльную глебу для распаўсюджвання гуманістычных ідэй і Рэфармацыі.

Адным з асноўных патрабаванняў дзеячаў Рэфармацыі было стварэнне больш дэмакратычнай і таннай царквы. Праціўнікі каталіцызму заяўлялі пра неабходнасць ліквідаваць духавенства як асобны сацыяльны стан, манастыры і манаства, складаную абраднасць, секулярызаваць царкоўную маёмасць. Ідэолагі Рэфармацыі выступалі супраць багаццяў царквы, аднак не адмаўляліся ад самой рэлігіі.

У першай палове XVI ст. Рэфармацыя ахапіла большасць краін Еўропы, у тым ліку Польшу. Рэфармацыя на тэрыторыі Беларусі развівалася ў рэчышчы еўрапейскага руху. У адрозненне ад заходнееўрапейскай яна развівалася тут на феадальнай аснове і мела іншую сацыяльную базу. У рэфармацыйны рух былі ўцягнуты магнаты, частка дробнай і сярэдняй шляхты. Асноўнымі рэфармацыйнымі плынямі ў Вялікім Княстве Літоўскім былі кальвінізм, лютэранства, антытрынітарызм. Актывізацыя радыкальнага накірунку ў Рэфармацыі назіраецца ў другой палове XVI ст. У рэлігійных дыскусіях прынялі актыўны ўдзел беларускія асветнікі Сымон Будны (1530--1593), Васіль Цяпінскі (1530--1603).

У канцы XVI – пачатку XVII ст. шляхта, напалоханая сацыяльным радыкалізмам антытрынітарыяў (забарона эксплуатацыі, валодання зямлёй, забарона ўдзелу ў войнах і г.д.), пераходзіць у лагер контррэфармацыі.

Каталіцка царква выпрацавала новую царкоўную стратэгію і палітыку барацьбы з рэфармацыйнымі рухамі.

У рэчышчы Контррэфармацыі адбылася актуалізацыя ідэі царкоўнай уніі. Яна не была новай.

Нацыянальна-рэлігійная канфрантацыя абвастрылася ў першай палове XVII ст. Насаджэнне ўніяцтва прывяло да народных паўстанняў (расправа з уніяцкім архіепіскапам І. Кунцэвічам у Віцебску). Урад Рэчы Паспалітай у 1633 г. афіцыйна прызнаў праваслаўную царкву, што знізіла канфесійную напружанасць у грамадстве.

Сеймы Рэчы Паспалітай прынялі законы (1668, 1673 гг.) аб увядзенні крымінальнай адказнасці за адступніцтва ад каталіцызму і ўніяцтва і забароне надання шляхецкай годнасці дысідэнтам. Пры актыўнай падтрымцы ўлад касцёл значна ўмацоўвае свае пазіцыі сярод шляхецкага саслоўя. У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. праваслаўная шляхта беларускіх зямель была далучана да каталіцкай веры ў сваёй большасці.

Пракаталіцкая дзяржаўная палітыка прывяла ў XVIII ст. да значнага скарачэння праваслаўных і пратэстанцкіх прыходаў. Цэнтрам праваслаўя была Магілёўская епархія. Праваслаўнае насельніцтва ў канцы XVIII ст. складала ўсяго 6,5%, пратэстанты – 1,6%, у той час як уніяты складалі 39%, католікі 38%.

Дыскрымінацыйная рэлігійная палітыка ўлад Рэчы Паспалітай ужо ў канцы XVII ст. стварыла так званае «дысідэнцкае пытанне». У XVIII ст. яно набыло міжнародны характар. У абарону аднаверцаў (праваслаўных, пратэстантаў) уключыліся замежныя краіны (Расія, Прусія, Швецыя), якія будуць доўгі час выкарыстоўваць дысідэнцкае пытанне ў вырашэнні сваіх геапалітычных задач.

**Рэлігійны склад насельніцтва Рэспублікі Беларусь.** *Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў канфесійнай сферы.*

Рэспубліка Беларусь – шматканфесійная дзяржава. У Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў. Агульная колькасць рэлігійных арганізацый на 1 студзеня 2022 г. – 3582, уключаючы 173 рэлігійныя арганізацыі, якія маюць агульнаканфесіянальнае значэнне (рэлігійныя аб’яднанні, манастыры, місіі, брацтвы, сястрыцтвы, духоўныя навучальныя ўстановы) і 3409 рэлігійных абшчын.

Агульная колькасць дзеючых культавых будынкаў складае 2829. Колькасць свяшчэннаслужыцелей – 3356, з іх – 122 замежных, якія пераважна запрашаюцца для ажыццяўлення рэлігійнай дзейнасці рэлігійнымі арганізацыямі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь.

Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае **Беларуская праваслаўная царква,** якая аб’ядноўвае 1726 праваслаўных прыходаў, 15 епархій, 6 духоўных навучальных устаноў, 36 манастыроў, 15 брацтваў, 9 сястрыцтваў, 1 місію. Дзейнічае 1781 праваслаўных храма, яшчэ 160 ствараюцца. З 2014 г. дзейнічае Духоўна-адміністрацыйны цэнтр –

Мінская Экзархія, які ўключае 19 сінодскіх аддзелаў і камісій.

**Рымска-каталіцкая царква** ў Рэспубліцы Беларусь аб'ядноўвае 4 епархіі, якая налічваюць 500 парафій. Дзейнічае 6 духоўных навучальных установ, 11 місій і 9 манастыроў. Парафіі маюць 516 культавых будынкаў, 33 будуецца.

**Грэка-каталіцкая царква** ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўлена 16 суполкамі, у якіх працуе 18 святарства. Дзейнічае 5 культавых будынкаў.

**Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі** прадстаўлены 1040 рэлігійнымі таварыствамі, 21 аб'яднаннем, 21 місіямі і 5 духоўнымі навучальнымі ўстановамі па 13 рэлігійных напрамках.

У Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваны 34 рэлігійныя таварыствы стараверaў, у распараджэнні вернікаў маецца 29 культавых будынкаў,.

У трох **іудзейскіх рэлігійных аб'яднаннях** налічваецца 50 рэлігійныя супольнасці, якія маюць 9 культавых будынкаў.

Таксама ў рэспубліцы дзейнічаюць 24 **мусульманскія рэлігійныя супольнасці**. Дзейнічае 6 мячэцей і 3 малітоўных дома, у тым ліку Саборная мячэць у г. Мінску, афіцыйнае адкрыццё якой адбылося 11 лістапада 2016 г.

У 2015 г. зарэгістравана **будысцкае таварыства** ў г. Мінску «Шен Чен Линг» традыцыі Бон.

Канфесіянальная палітыка дзяржавы накіравана на падтрыманне і ўмацаванне міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі, у першую чаргу з Беларускай праваслаўнай царквой. Ва ўзаемаадносінах з рэлігійнымі арганізацыямі дзяржава кіруецца заканадаўча замацаваным прынцыпам роўнасці рэлігій перад законам і ўлічвае іх уплыў на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Рэспубліка Беларусь мае ўнікальны для ўсіх краін СНД вопыт супрацоўніцтва з рэлігійнымі арганізацыямі. У 2003 г. падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой, у рамках якога былі распрацаваны сумесныя праграмы супрацоўніцтва. Іх рэалізацыя дазваляе забяспечыць удзел царквы там, дзе найбольш запатрабаваны яе вопыт і аўтарытэт: у сферах выхавання і адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, аховы навакольнага асяроддзя.

Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь стварае прававое поле, у якім рэлігійныя арганізацыі могуць паўнавартасна дзейнічаць і развівацца, а грамадзянам гарантуюцца іх канстытуцыйныя правы на свабоду сумлення і веравызнання.

У адпаведнасці з артыкулам 31 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожны мае права самастойна вызначаць сваё дачыненне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію або не

спавядаць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з дачыненнем да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

Артыкул 4 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» гарантуе права кожнага на свабоду выбару атэістычных або рэлігійных перакананняў, а менавіта: самастойна вызначаць сваё дачыненне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай. Акрамя гэтага, у адпаведнасці з артыкулам 5 указанага Закона кожны мае права свабодна выбіраць, мець, мяняць, выказваць і распаўсюджваць рэлігійныя перакананні і згодна з імі дзейнічаць, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Пры гэтым ніхто не абавязаны паведамляць аб сваім дачыненні да рэлігіі і не можа падвяргацца якому-небудзь прымусу пры вызначэнні свайго дачынення да рэлігіі, да спавядання той або іншай рэлігіі, да ўдзелу або няўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый.

У адпаведнасці з часткай 3 артыкула 16 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды або звязана з парушэннем праў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або наносіць шкоду іх здароўю і маральнасці.

Пры гэтым дзяржава не ўмешваецца ў пытанні прыватнага спавядання той або іншай рэлігіі, а кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый абмяжоўваецца сферай выканання імі заканадаўства рэспублікі, не дапускаючы ўмяшання ва ўнутраныя справы канфесій. Канстытуцыя краіны і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» устанаўліваюць роўнасць усіх рэлігій і веравызнанняў перад законам.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам рэлігійныя арганізацыі падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі, якая надае ім статус юрыдычнай асобы і дазваляе паўнавартасна ажыццяўляць прадугледжаную статутнымі дакументамі рэлігійную, гаспадарчую, дабрачынную і іншую дзейнасць, устанаўліваць сувязі і кантакты з юрыдычнымі асобамі ў краіне і за мяжой. Дзяржава гарантуе права грамадзян на сумеснае веравызнанне. Грамадзяне маюць права стварыць рэлігійную арганізацыю, зарэгістраваўшы яе ў вызначаным заканадаўствам парадку.

**Геапалітычны фактар фарміравання беларускай дзяржаўнасці.** Рэалізаваўшы сваё права на самавызначэнне, Рэспубліка Беларусь праводзіць самастойную знешнюю палітыку.

Геаграфічнае становішча нашай дзяржавы, на тэрыторыі якой сыходзяцца найважнейшыя транспартныя шляхі паміж Еўропай і Азіяй, і

няпростая гісторыя краіны, якая выпрабавала на сабе разбуральныя наступствы шматлікіх еўрапейскіх войнаў і канфліктаў, абумовілі курс на шматвектарнасць знешняй палітыкі як фундаментальны прынцып, які прадугледжвае развіццё збалансаваных канструктыўных адносін з партнёрамі ў розных рэгіёнах свету. Прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь -- прагматычнасць і паслядоўнасць, узаемная павага, раўнапраўе, неўмяшанне ва ўнутраныя справы, адмова ад ціску і прымусу. Фарміраваць міжнародны курс краіне прыходзіцца ў няпростых умовах. Свет ўступіў у стадыю кардынальных геапалітычных, эканамічных, грамадскіх і іншых перамен, якія характарызуюцца высокай інтэнсіўнасцю і дынамічнасцю. Станаўленне новых цэнтраў сілы суправаджаецца абвастрэннем суперніцтва дзяржаў і канкурэнцыяй мадэлей будучага развіцця. Беларусь пасля атрымання незалежнасці здолела выбудаваць адносіны са знешнім светам, не пасупіўшыся сваімі нацыянальнымі інтарэсамі. Гэта дазволіла краіне ўпэўнена і эфектыўна прасоўваць і адстойваць свае знешнепалітычныя мэты і прыярытэты, нарошчваць узаемавыгадныя сувязі з рознымі дзяржавамі свету, фарміраваць умовы для стабільнага развіцця эканомікі і павышэння ўзроўню жыцця грамадзян.

Беларусь імкнецца ўнесці свой уклад у вырашэнне глабальных і рэгіянальных праблем, традыцыйна актыўна ўдзельнічае ў дзейнасці ААН і іншых міжнародных арганізацый. Ініцыятыва Беларусі ў ААН па сістэмнаму вырашэнню проблемы гандлю людзьмі была з энтузіязмам успрынята партнёрамі з ліку міжнародных і няўрадавых арганізацый і атрымала безумоўную падтрымку дзяржаў -- членаў Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. У рэзалюцыі 68-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па барацьбе з гандлем людзьмі Беларусь ініцыявала ўстанову Сусветнага дня барацьбы з гандлем людзьмі, які штогод адзначаецца 30 ліпеня. Важным дасягненнем беларускай дыпламатыі ў сферы супрацьдзеяння гандлю людзьмі стала распаўсюджванне сумесных міжнародных намаганняў на новую сферу -- прадухіленне гандлю чалавечымі органамі. У ходзе 23-і сесіі Камісіі ААН па папярэджаннізлачыннасці і крымінальным правасуддзі па ініцыятыве Беларусі прынята рэзалюцыя «Папярэджанне незаконнага абароту органаў чалавека, уключаючы гандаль людзьмі з мэтай здабывання органаў».

На новы ўзровень выйшла беларуская ініцыятыва па абароне інстытута сям’і і прасоўванні традыцыйных сямейных каштоўнасцей.

Значныя намаганні канцэнтраваліся на актывізацыі міжнароднага супрацоўніцтва па чарнобыльскай праблематыцы і прасоўванні ідэі шматбаковага садзейнічання развіццю краін з сярэднім узроўнем даходу.

У 2014 г. па ініцыятыве Беларусі як старшыні СНД Генеральная Асамблея ААН упершыню прыняла рэзалюцыю «Супрацоўніцтва паміж ААН і СНД».

У поўнай меры усведамляючы небяспеку крызісу ва Украіне для ўсяго рэгіёну, Беларусь у рамках сваіх магчымасцей

распачала інтэнсіўныя намаганні для садзейнічання яго ўрэгуляванню. Практычным вынікам гэтых намаганняў сталі Мінскія дамоўленасці, якія спрыялі дээскалацыі канфлікту і яго пераводу ў палітыка-дыпламатычнае рэчышча, якому няма альтэрнатывы. Знешнепалітычныя вынікі садзейнічаюць умацаванню пазіцый і аўтарытэту Беларусі на міжнароднай арэне, пераасэнсаванню

шэрагам замежных партнёраў ролі і месца краіны ў забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі і
стабільнасці, развіцці інтэграцыйных працэсаў.

Пастаянна ўмацоўваецца стратэгічнае беларуска-расійскае супрацоўніцтва. З утварэннем 1 студзеня 2015 г. Еўразійскага эканамічнага саюза еўразійская інтэграцыя выйшла на якасна новы ўзровень. Пазітыўныя вынікі прыносяць мэтанакіраваныя крокі па актывізацыі прагматычнага ўзаемадзеяння Беларусі з Еўрасаюзам, інтэнсіфікацыі яе дыялога з ЗША.

Стратэгічны ўзровень узаемадзеяння дасягнуты Беларуссю ў адносінах з КНР, нарошчваюцца кантакты з іншымі дзяржавамі Азіі. Пашыраецца беларуская прысутнасць у Лацінскай Амерыцы. Беларусь паступальна ўзмацняе ўзаемадзеянне і з краінамі Афрыкі, актыўна асвойвае абсалютна новыя рынкі на гэтым кантыненце.

Вядучым органам, які ажыццяўляе знешнепалітычную дзейнасць дзяржавы, з'яўляецца Міністэрства замежных спраў (МЗС) Рэспублікі Беларусь. У снежні 1998 г. на аснове МЗС, Міністэрства знешнеэканамічных сувязей і апарата Міністэрства па справах СНД створана адзінае Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, галоўнымі задачамі якога сталі каардынацыя знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці дзяржавы, а таксама развіццё гандлёва-эканамічных сувязей Беларусі з замежнымі дзяржавамі.

З 1992 г. пачалося фарміраванне сеткі дыпламатычных прадстаўніцтваў

Найбольш поўна прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь выкладзеныя ў Канстытуцыі краіны (артыкул 18), дзе, у прыватнасці, гаворыцца: «Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права».

Зыходзячы з рэалій геапалітычнага становішча краіны, беларускае кіраўніцтва паклала ў аснову знешняй палітыкі дзяржавы прынцып шматвектарнасці, разумеючы яго як адсутнасць геаграфічных абмежаванняў у працы і наданні роўнай ўвагі ўсім рэгіёнам свету. Найважнейшай задачай беларускай дыпламатыі з'яўляецца падтрыманне балансу паміж еўрапейскай і еўразійскай палітычнай і эканамічнай прасторай. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца паслядоўным прыхільнікам

фарміравання шматпалярнай сістэмы міжнародных адносін, якая адлюстроўвае разнастайнасць сучаснага свету і ўлічвае інтарэсы ўсіх дзяржаў планеты.

Стратэгічнымі мэтамі знешняй палітыкі Беларусі з'яўляюцца: забеспячэнне бяспекі краіны, захаванне і ўмацаванне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, абарона інтарэсаў грамадства, асобы і дзяржавы.

**Шматвектарнасць знешняй палітыкі**

Рэспубліка Беларусь праводзіць паслядоўную палітыку ў сферы міжнароднай бяспекі, нераспаўсюджання зброі масавага знішчэння, раззбраення і кантролю над узбраеннямі. Яна першай з краін -- ядзерных пераемнікаў былога Савецкага Саюза -- далучылася да Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі (ДНЯЗ), ратыфікавала Дагавор аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (СТАРТ-1) і Лісабонскі Пратакол 1992 г. У 1992 г. за межы Беларусі была выведзена тактычная ядзерная зброя былога СССР. Стратэгічныя ядзерныя сілы на беларускай тэрыторыі перайшлі пад юрысдыкцыю Расіі і з сакавіка 1994 г. пачалі выводзіцца за межы Беларусі (працэс вываду ракет завяршыўся ў лістападзе 1996 г.), пры гэтым Беларусь не дамагалася кампенсацыі за адмову ад ядзернай зброі. У адпаведнасці з Дагаворам аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці (РСМД) Рэспубліка Беларусь знішчыла 584 ракеты, а таксама іх пускавыя ўстаноўкі і дадатковае абсталяванне.

Беларусь афарміла свой удзел практычна ва ўсіх шматбаковых і рэгіянальных дамоўленасцях, накіраваных на скарачэнне, кантроль і нераспаўсюджвання зброі масавага знішчэння.

У 1995 г. Беларусь падпісала Пагадненне аб гарантыях з МАГАТЭ. У 1996 г. у Беларусі была створана дзяржаўная сістэма па ўліку, кантролі і фізічнай абароне ядзернага матэрыялу. Рэспубліка Беларусь далучылася да Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ДОВСЕ), Канвенцыі аб забароне хімічнай зброі (КЗХО), Канвенцыі аб забароне біялагічнай і таксіннай зброі, Дагавора аб усёабдымнай забароне ядзерных выпрабаванняў (ДУЗЯВ). У 2000 г. Беларусь была прынята ў Групу ядзерных пастаўшчыкоў, што з'явілася доказам яе поўнай адпаведнасці нормам экспартнага кантролю, прызнаным на міжнародным узроўні. У лістападзе 2005 г. Беларусь падпісала Дадатковы пратакол да Пагаднення аб гарантыях з МАГАТЭ, пацвердзіўшы сваю прыхільнасць да прынцыпаў нераспаўсюджвання ядзернай зброі і прызнанне міжнароднага аўтарытэту Агенцтва ў справе праверкі выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах.

Нягледзячы на эканамічныя і фінансавыя цяжкасці, Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з Дагаворам аб звычайных узброеных сілах у Еўропе знішчыла 1773 танка, 1341 бронемашыну і 130 самалётаў, што складае каля 10% ўзбраенняў і тэхнікі ад агульнай колькасці ваеннага абсталявання, ліквідаванага усімі 30 дзяржавамі -- удзельнікамі ДОВСЕ .

Гэта амаль у 3 разы больш, чым знішчылі ЗША, Вялікабрытанія і Францыя разам узятыя. Таксама Беларусь стала першай дзяржавай-удзельнікам, якая ратыфікавала Пагадненне аб адаптацыі ДЗУСЕ ў 2000 г. На момант атрымання незалежнасці Рэспубліка Беларусь мела амаль паўмільённую групоўку войскаў. У ходзе завяршальнага этапу рэфармавання да пачатку 2005 г. колькасць беларускай арміі была аптымізавана і склала 65 тыс. чалавек.

У рамках Венскага дакумента 1999 г. па мерах умацавання даверу і бяспекі (МДБ) у 2001 г. было дасягнута палітычнае пагадненне аб дадатковых МДБ з Літвой, падпісана міжурадавае пагадненне аб дадатковых МДБ з Украінай.

У 2001 г. Беларусь ратыфікавала Дагавор па адкрытым небе, тым самым падкрэсліўшы сваю важную ролю ў стварэнні новай архітэктуры еўрапейскай бяспекі ад Ванкувера да Уладзівастока.

Беларусь з’яўляецца актыўным удзельнікам міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне супрацьпяхотных мін. З 1995 г. у Беларусі ўведзены і няўхільна выконваецца мараторый на экспарт ўсіх відаў проціпяхотных мін. 3 верасня 2003 г. Генеральнаму сакратару ААН былі перададзены ратыфікацыйныя граматы аб далучэнні Беларусі да Атаўскай канвенцыі аб забароне прымянення, назапашвання запасаў, вырабу і перадачы супрацьпяхотных мін і аб іх знішчэнні. Стаўшы ўдзельнікам Атаўскай канвенцыі, Беларусь узяла на сябе абавязацельства утылізаваць запасы супрацьпяхотных мін.

Рэспубліка з’яўляецца ўдзельнікам усіх 12 існуючых канвенцый і пратаколаў па пытаннях барацьбы з тэрарызмам, прынятых пад эгідай ААН. Беларусь прымае ўдзел у прадухіленні распаўсюджвання і выкарыстання тэрарыстамі ядзернай, біялагічнай, хімічнай і звычайнай зброі і тэхналогій яе вытворчасці, наладзіла канструктыўнае ўзаемадзеянне з контртэрарыстычным камітэтам Савета Бяспекі ААН. Важным складнікам барацьбы з міжнародным тэрарызмам беларускі бок лічыць ўсталяванне надзейнай сістэмы пагранічнага і мытнага кантролю ў мэтах прадухілення незаконных перавозак праз беларускую мяжу зброі і боепрыпасаў, спынення нелегальнай міграцыі, абароту наркотыкаў і недапушчэння іншай дзейнасці, звязанай з тэрарызмам. Рэспубліка Беларусь з’яўляецца добрасумленным удзельнікам 6 асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека і 8 асноватворных канвенцый Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), выступае за канструктыўнае міжнароднае супрацоўніцтва ў праваабарончай галіне на прынцыпах узаемнай павагі і раўнапраўнага партнёрства. У той жа час яна лічыць бесперспектыўным выкарыстанне праваабарончай тэматыкі ў якасці сродку прасоўвання палітычных і эканамічных інтарэсаў.

14 лістапада 2005 г. прыняты Закон «Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь», у якім вызначаны прынцыпы,

стратэгічныя мэты, асноўныя задачы і сферы ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы.

Атрыманне незалежнасці пашырыла магчымасці ўдзелу Беларусі ў рабоце вядучых міжнародных арганізацый. У 2008 г. Рэспубліка Беларусь з'яўлялася членам 69 міжнародных міжурадавых арганізацый. Дзякуючы шматлікім ініцыятывам у рамках міжнародных арганізацый у такіх галінах, як міжнародная бяспека і раззбраенне, ўстойлівае развіццё ў інтарэсах усіх дзяржаў, Беларусь стала шырока вядомая ў свеце як міралюбная дзяржава, якая прытрымліваецца міжнароднага права і раўнапраўнага супрацоўніцтва з усімі краінамі свету. Галоўным напрамкам дзейнасці беларускай дыпламатыі на шматбаковым узроўні з'яўляецца пашырэнне і ўмацаванне сувязей з былымі савецкімі рэспублікамі ў рамках СНД. 8 снежня 1991 г. Рэспубліка Беларусь выступіла ў якасці сузаснавальніка гэтай міжнароднай арганізацыі. У студзені 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў Статут СНД. Месцазнаходжаннем Выканаўчага камітэта СНД з'яўляецца г. Мінск. У рамках канцэпцыі рознахуткаснай інтэграцыі асобныя краіны СНД сталі прасоўвацца па шляху больш цеснага збліжэння ў сферах эканомікі і бяспекі. У 1995 г. Беларусь, Расія і Казахстан зрабілі першую спробу стварыць Мытны саюз. 29 сакавіка 1996 г. кіраўнікі Беларусі, Расіі, Кыргызстана і Казахстана падпісалі ў Маскве Дагавор «Аб паглыбленні інтэграцыі ў эканамічнай і гуманітарнай галінах». У 1998 г. да «чацвёркі» далучыўся Таджыкістан. У 1999 г. на аснове «пяцёркі» створаны Мытны саюз, які ў 2000 г. пераўтвораны ў Еўразійскую эканамічную супольнасць (ЕўрАзЭС).

У маі 2001 г. пасля ратыфікацыі парламентамі ўсіх краін-заснавальніц дамоўленасць аб стварэнні ЕўрАзЭС уступіла ў сілу. На сённяшні дзень ЕўрАзЭС з'яўляецца найбольш дынамічна развіваючымся інтэграцыйным аб'яднаннем на постсавецкай прасторы. Двойчы (у 2005 і 2008 гг.) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка абіраўся Старшынёй Міждзяржаўнага Савета ЕўрАзЭС. У 2009 г. пачаў функцыянаваць Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана. 6 ліпеня 2010 г. уступіў у дзеянне яго кодэкс. У канцы 2010 г. дзяржавы Мытнага саюза падпісалі пакет пагадненняў, якія фарміруюць дагаворна-прававую базу Адзінай эканамічнай прасторы. У 1993 г. Беларусь далучылася да Ташкенцкая дамовы 1992 г. аб стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі СНД з агаворкай, што беларускія вайскоўцы не будуць удзельнічаць у баявых дзеяннях за межамі Беларусі. У 1999 г. Беларусь пацвердзіла свой удзел у сістэме калектыўнай бяспекі СНГ, выказаўшы намер прыкрываць яе заходні фланг. У кастрычніку 2000 г. Рэспубліка Беларусь падпісала пагадненне аб статусе фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі (акрамя Беларусі гэта пагадненне падпісалі Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Расія і Таджыкістан), у маі 2001 г. падтрымала рашэнне аб стварэнні шматбаковых сіл хуткага разгортвання ў Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне. У

маі 2002 г. Рэспубліка Беларусь падтрымала прапанову аб пераўтварэнні Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў міжнародную рэгіянальную арганізацыю. Беларусь разглядае паўнавартасны ўдзел у дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) не толькі ў якасці важнага прыярытэту па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі, але і ў якасці сур’ёзнага інструмента па ўмацаванні стабільнасці на постсавецкай прасторы.

Адным з найважнейшых напрамкаў дзейнасці беларускай дыпламатыі ў пачатку 1990-х гг. з’яўлялася развіццё супрацоўніцтва з вядучымі еўрапейскімі арганізацыямі -- Саветам Еўропы і Еўрапейскім Саюзам (ЕС). У жніўні 1992 г. Рэспубліка Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з ЕС. У верасні 1992 г. Беларусь атрымала статус «спецыяльна запрошанага» ў Савеце Еўропы, у сакавіку 1993 г. падала заяўку на прыём у гэту арганізацыюў якасці паўнапраўнага члена. Паспяхова развівалася супрацоўніцтва Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з Еўрапарламентам.

Падчас афіцыйнага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Бельгію ў Брусэлі 6 сакавіка 1995 г. было падпісана Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і ЕС (СПС). У тым жа годзе пачаўся працэс ратыфікацыі названага пагаднення парламентамі Беларусі (Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў пагадненне 12 красавіка 1995 г.) і 15 краін - членаў ЕС (да канца 1996 г. пагадненне ратыфікавалі парламенты Даніі, Іспаніі, Ірландыі, Вялікабрытаніі, Швецыі, Грэцыі, Аўстрыі, Італіі). 26 сакавіка 1996 г. Рэспубліка Беларусь і ЕС падпісалі Часовае пагадненне аб гандлі, якое павінна было дзейнічаць да ўступлення СПС у сілу. Еўрапейскі Саюз даў Беларусі льготны рэжым у дачыненні да паставак шэрага беларускіх тавараў на рынкі еўрапейскіх краін. Пачынаючы з 1991 г. у Рэспубліцы Беларусь было рэалізавана больш за 200 праектаў ТАСІС з сукупным бюджэтам больш за 150 млн еўра.

У 1996 г. адносіны паміж Беларуссю і еўрапейскімі арганізацыямі пагоршыліся. У студзені 1997 г. Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы часова прыпыніла статус «спецыяльна запрошанага» для Рэспублікі Беларусь. 15 верасня 1997 г. Савет Міністраў ЕС у адмысловай заяве па сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь абвясціў аб прыпыненні працэсу ратыфікацыі СПС і эканамічных пагадненняў з Беларуссю, згортванні кантактаў на палітычным узроўні, адмове ад падтрымкі працэсу ўступлення Беларусі ў Савет Еўропы. Структуры ЕС вырашылі таксама прыпыніць праграмы тэхнічнага садзейнічання Беларусі, за выключэннем гуманітарных і рэгіянальных праектаў, накіраваных на падтрымку працэсу дэмакратызацыі.

У сувязі з адкрыццём у Беларусі офіса АБСЕ і аднаўленнем паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай

Асамблеі АБСЕ ў 2003 г. намеціліся рэальныя перадумовы для размарожвання дыялогу з Еўрасаюзам. Беларускі бок выказаў гатоўнасць ажыццяўляць дыялог з ЕС па праблемах нелегальнай міграцыі, гандлю людзьмі, наркатрафіку, бяспекі межаў, пашырыць узаемадзеянне з еўрапейскімі арганізацыямі ў рамках еўрапейскай «палітыкі суседства», распрацаванай у 2003--2004 гг. структурамі ЕС для краін, якія не маюць кароткатэрміновай перспектывы членства ў Еўрасаюзе. У 2003 г. Рэспубліка Беларусь падключылася да трох так званых «праграм суседства» ЕС, накіраваных на развіццё супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні ўздоўж заходняй беларускай мяжы за кошт фінансавых інструментаў садзейнічання Еўрасаюза. У 2008 г. намеціліся пазітыўныя змены ў адносінах Беларусі з ЕС і Саветам Еўропы.

Нягледзячы на няпростыя палітычныя адносіны і недастаткова развітую прававую базу двухбаковага ўзаемадзеяння, суседства з Еўрасаюзам мае для Рэспублікі Беларусь стратэгічнае значэнне. ЕС з’яўляецца адным з ключавых гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі, займаючы другую пазіцыю пасля Расіі.

Важным напрамкам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь стала пашырэнне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Галоўным партнёрам Беларусі ў Азіі з’яўляецца Кітайская Народная Рэспубліка. Беларуска-кітайскія адносіны захоўваюць сяброўскі характар, іх адрознівае ўзаемная павага бакоў, неўмяшанне ва ўнутраныя справы адзін аднаго і поўнае паразуменне па асноўных пытаннях сучасных міжнародных адносін. У ліпені 2000 г. Беларусь і Кітай падпісалі Сумесную заяву аб умацаванні ўсебаковага супрацоўніцтва ў XXI ст., выказаўшы намер развіваць палітычны дыялог і кантакты на ўсіх узроўнях, уключаючы вышэйшы. Сёння беларуска-кітайскі палітычны дыялог выйшаў на ўзровень стратэгічнага ўзаемадзеяння і праводзіцца ў духу дружбы і высокага даверу. Ажыццяўляецца буйнамаштабнае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, рэалізуюцца шматмільённыя інвестыцыйныя праекты.

Для Кітая мэты партнёрства простыя. Беларусь з’яўляецца часткай кітайскай ініцыятывы «Пояс і шлях», запушчанай у 2013 г. Гэта ініцыятыва, якая атрымала назву «кітайскі план Маршала», мяркуе інвеставанне мільярдаў долараў у інфраструктуры краін, размешчаных уздоўж старога «Шаўковага шляху», каб связаць Кітай з Еўропай. Прывабнасць Беларусі заключаецца пераважна ў яе геаграфічным месцазнаходжанні. Краіна валодае патэнцыялам стаць «транспартнымі варотамі», якія злучаюць Кітай з Еўрапейскім саюзам і краінамі СНД ўздоўж новага сухапутнага моста ў Еўразіі.

Найважнейшым прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі з’яўляецца збліжэнне з Расіяй. 21 лютага 1995 г. быў падпісаны Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве, які аформіў адносіны Беларусі і Расіі як стасункі суверэнных, раўнапраўных дзяржаў. 2 красавіка 1996 г. у Маскве

падпісаны Дагавор аб Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. 2 красавіка 1997 г. падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі, які стаў мадэллю міждзяржаўнага аб'яднання з больш высокай, у параўнанні з СНД, ступенню палітычнай і эканамічнай інтэграцыі. Чарговым крокам на шляху міждзяржаўнага збліжэння стала падпісанне прэзідэнтамі Беларусі і Расіі 8 снежня 1999 г. Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы (ўступіў у сілу ў студзені 2000 г.).

Падмуркам рэалізацыі беларуска-расійскага інтэграцыйнага праекта з'яўляюцца эканамічныя адносіны. Расія з'яўляецца асноўным знешнегандлёвым партнёрам Рэспублікі Беларусь і спажыўцом прадукцыі, якая выпускаецца беларускімі вытворцамі, яе доля ў знешнім гандлі Беларусі перавышае 50%.